**Барыла, А.** Ушануем памяць герояў, або Адкрыццё памятнага знака ў скверы ДРБУ-131 / А. Барыла // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2011. — 6 жн. — С. 1, 7.

## УШАНУЕМ ПАМЯЦЬ ГЕРОЯЎ, АБО АДКРЫЦЦЁ ПАМЯТНАГА ЗНАКА Ў СКВЕРЫ ДРБУ-131

*Им бы звёзды — не на погоны,*
*Не на могилы, не на грудь,*
*Им бы звёзды неба родного,*
*Да здоровья, да жизни вернуть.*
*Нет, не трусили — погибали,*
*Множа мужество, славу, честь.*
*В гроб цинковый их одевали,*
*Чёрной птицей летела весть.*

Такімі вершаванымі словамі распачалася ўрачыстасць, прысвечаная адкрыццю памятнага знака воінам-інтэрнацыяналістам, якая праходзіла 2 жніўня ў скверы ДРБУ-131 (на ўездзе ў Шаркаўшчыну з Глыбоцкага накірунку).

– Добры дзень, паважаныя жыхары Шаркаўшчыны! – прывіталі прысутных вядучыя. – Так сталася, што савецкія салдаты абаранялі не толькі сваю Радзіму, але дапамагалі брацкім народам. І называлася гэта «выкананне інтэрнацыянальнага абавязку». І тады, у далёкім 1979 годзе, савецкія войскі пайшлі дапамагаць будаваць шчаслівае жыццё ў Афганістане. Шмат гора і бед прынесла нашаму народу гэта страшная вайна ў чужым краі. Але там, у далёкім Афгане савецкія воіны праяўлялі найлепшыя чалавечыя якасці: мужнасць, высакароднасць. У цяжкіх умовах баявога жыцця, удалечыні ад дома, пастаянна знаходзячыся ў смяртэльнай небяспецы, яны засталіся вернымі воінскай прысязе і чалавечаму абавязку.

Права адкрыць памятны знак прадаставілі воінам-інтэрнацыяналістам Валянціну Міхайлавічу Кукліну і Івану Іванавічу Матыскіну. Старшыня райвыканкама Мечыслаў Віктаравіч Морхат павіншаваў воінаў-інтэрнацыяналістаў з тым, што ў іх з’явілася месца, куды можна прыйсці і ўшанаваць памяць герояў, а таксама падзяліцца думкамі.

Свае віншаванні прысутным, у прыватнасці, тым, хто ваяваў у Афганістане, адрасавалі старшыня абласнога Савета грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валяр’ян Альбінавіч Мацкевіч і ваенны лётчык Мікалай Іванавіч Стаціўка. Афіцэры падзяліліся ўспамінамі пра вайну.

Былы раённы ваенны камісар Валянцін Міхайлавіч Куклін пажадаў усім, хто прайшоў афганскія выпрабаванні, моцнага здароўя і смейнага дабрабыту.

Воін-інтэрнацыяналсіт Васілій Савіч Протас выканаў песню «Кукушка» – своеасаблівы экскурс у далёкае баявое мінулае.

*Слёзы горячие наши*
*Да одолеют броню,*
*Души наши незрячие*
*Да сподобятся вечного света!*
*Не обмани, не убей, пожалей,*
*Возлюби человек человека!*
*И простится тебе на земле,*
*И воздастся в раю…*

Пад гэтыя словы да памятнага знака накіраваліся праваслаўныя святары айцы Віктар Валашчук і Пётр Бараноўскі. Пасля агульнай малітвы адбылося асвячэнне.

І вось з’явіліся дзяўчаты ў белым з лампадкамі. Пад кранальную мелодыю яны наблізіліся да помніка. Затым вянок ад райвыканкама ўсклалі яго старшыня Мечыслаў Віктаравіч Морхат і першы намеснік старшыні Мікалай Ірынархавіч Баговіч. Воіны-інтэрнацыяналісты і прадстаўнікі працоўных калектываў усклалі гірлянды, вянкі, кветкі. Усе разам ушанавалі памяць герояў, якія не вярнуліся дамоў з вайны хвілінай маўчання. Над скверам разняслося рэха салюту.

Вядучыя адзначылі, што з гэтага дня – а адкрыццё праводзілася 2 жніўня, у дзень паветрана-дэсантных войск (часці ПДВ першымі ўвайшлі ў Афганістан) – у шаркаўчан з'явілася яшчэ адно памятнае месца. Застаецца спадзявацца, што ў сквер будзе прыходзіць моладзь, будучыя абаронцы Айчыны, маладажоны і іншыя. Усе яны змогуць ушанаваць памяць герояў. Дарэчы, на заканчэнні мітынгу воіну-інтэрнацыяналісту Віктару Качану быў уручаны нагрудны знак «За заслугі».

Пасля гэтага пачалася другая частка свята – канцэртная праграма. Імправізаваная сцэна была створана каля магазіна «Журавінка». Перад прысутнымі выступалі культработнікі і самадзейныя артысты з Шаркаўшчыны, а таксама з вёсак. Ім удалося стварыць па-сапраўднаму святочную атмасферу. Побач працавалі гандлёвыя палаткі райспажыўтаварыства. Была разгорнута палявая кухня – жадаючыя маглі паспрабаваць салдацкай кашы з чаем.

Такім чынам, задума ўдалася і адкрыццё помніка ператварылася ў свята мікрараёна меліяратараў. Колькасць прысутных сведчыць пра тое, што людзям падабаюцца такія мерапрыемствы.








***Аляксандр БАРЫЛА***
***НА ЗДЫМКАХ****: Віктар Качан з узнагародай; моманты ўрачыстасці.*